**23.** Дадзены сказы:

*1. Мова _ гэта вялікі народны скарб* (І. Мележ).

*2. Ахоўваць прыроду _ значыць любіць усё* жывое (У. Ягоўдзік).

*3. Адвечнае дрэва _ дуб* (І. Шамякін).

У якім(-іх) сказе(-ах) на месцы пропуску неабходна паставіць працяжнік?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** у 1. **В)** у 2. **Г)** у 1, 2. **Д)** у 2, 3.

---

**24.** Верш “Бывай…” у свой час быў прысвечаны Алесі Карыткінай, першаму юнацкаму каханню … .

**А)** Максіма Багдановіча. **Б)** Максіма Лужаніна. **В)** Аркадзя Куляшова.
**Г)** Петруся Броўкі. **Д)** Пятра Глебкі.

---

**25.** Вядомы класік беларускай літаратуры сказаў: “Чалавека няма без продкаў, народа няма без гісторыі.” Каму належыць выказванне?

**А)** Максіму Багдановічу. **Б)** Адаму Міцкевічу. **В)** Івану Шамякіну.
**Г)** Уладзіміру Караткевічу. **Д)** Максіму Танку.

---

**26.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***я***?

*1) м..дуза; 2) м..рэжка; 3) м..нзурка; 4) м..целіца.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**27.** У 1953 годзе ў вучнёўскім альманаху “Першыя крокі” пад псеўданімам Алесь Чабор былі апублікаваны першыя вершы … .

**А)** Міхася Стральцова. **Б)** Генадзя Бураўкіна. **В)** Рыгора Барадуліна.
**Г)** Яўгеніі Янішчыц. **Д)** Веры Вярбы.

---

**28.** Як называецца размеркавальная база даных, што складаецца з блокаў, у якіх запісваецца і захоўваецца інфармацыя?

**А)** флэшка. **Б)** блокчэйн. **В)** каршэрынг. **Г)** стартап. **Д)** лаўкостар.

---

**29.** “Каробка з-пад торта” – так смехам называў у свой час Янка Купала будынак … .

**А)** свайго дома. **Б)** Вялікага тэатра оперы і балета.
**В)** вакзала. **Г)** тэатра лялек. **Д)** драматычнага тэатра.

---

**30.** Адметны празаік і паэт, удумлівы філосаф, першы крытык, які распрацоўваў метадалагічныя пытанні літаратуразнаўства, адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў літаратурна-мастацкіх аб’яднанняў “Маладняк” і “Узвышша”. “Маладнякоўскі” Бялінскі” – так называлі яго ў 1920-ыя гады мінулага стагоддзя. Хто гэта?

**А)** Анатоль Вольны. **Б)** Язэп Пушча. **В)** Міхась Зарэцкі.
**Г)** Алесь Гурло. **Д)** Адам Бабарэка.

---

КОНКУРС

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 6. Тыраж 6700 экз. 2023 г.

Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры

# «БУСЛІК-2023»

*Чацвер, 16 лютага 2023 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 10-11 класаў

**1.** Уважліва прачытайце вершаваныя радкі Якуба Коласа. Колькі назоўнікаў, якія маюць два склады, у прыкладзе?

*Люблю я зімы з маразамі,*
*Завеі белыя ў палях,*
*І снегу скрып пад палазамі,*
*І ціш зімовую ў лясах.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**2.** Вызначце колькасць слоў у вершаваных радках М. Багдановіча, якія маюць адзін ***[а]***.

*Няяркая, маленькая вясёлка*
*Ўкруг месяца ледзь бачна зіхаціць…*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 4. **Д)** 6.

---

**3.** Дадзены сказ:

*Я не хачу, каб рэчка высыхала, дзе чую ўсплёскі рыбак залатых, дзе човен скача ля свайго прычала, калі бягу па травах лугавых* (Э. Агняцвет).

Колькі даданых частак у сказе?

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**4.** Спецыяліст, які займаецца мёдаварэннем, называецца … .

**А)** повар. **Б)** пчаляр. **В)** інструктар. **Г)** медавар. **Д)** бортнік.

**5.** Якія спалучэнні слоў з прапанаваных утвораны правільна?

*1) два памножыць у тры; 2) дзесяць падзяліць на пяць;*

*3) дваццаць чатыры падзяліць у чатыры; 4) сем памножыць на пяць.*

**А)** усе спалучэнні слоў. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**6.** Вызначце з дадзеных складаныя сказы:

*1) Ты можаш не любіць беларускую мову, але толькі яна можа палюбіць цябе* (С. Дубавец).

*2) Слова наша роднае, хапала на стагоддзі доўгія цябе* (Г. Бураўкін).

*3) Не ўсё яшчэ вядома мне, не ўсё вядомае адкрыта* (А. Пысін).

**А)** усе сказы. **Б)** няма складаных сказаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**7.** Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае слова?

*Бацькоўскі дом на хутары цяпер* ***мой****.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем. **Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

---

**8.** У якім(-іх) народным(-ых) выразе(-ах) выдзелены назоўнік напісаны правільна?

*1. Каб назбіраць ягад, трэба пакланіцца кожнай* ***ягадке****.*

*2. Лепш у* ***руке*** *верабей, чым сініца ў небе.*

*3. Лепш у сваёй* ***хатцы****, чым у чужым палацы.*

**А)** ва ўсіх выразах. **Б)** няма такіх выразаў. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**9.** Падлічыце колькасць памылак, дапушчаных у сказе.

*Рыбаловства – старадаўні народный промысел.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**10.** Арганізаваны па законах мовы працэс выказвання моўных сродкаў у камунікацыі называецца … .

**А)** фантазія. **Б)** маўленне. **В)** слуханне. **Г)** гаварэнне. **Д)** маляванне.

---

**11.** Вызначце няправільна напісаныя дзеясловы ў форме 2 асобы множнага ліку.

*1) склеяце; 2) ідзіце; 3) гледзяце.*

**А)** усе дзеясловы. **Б)** няма такіх дзеясловаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**12.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце літару ***к***?

*1) э..зэмпляр; 2) вы..лап; 3) ане..дот; 4) э..слібрыс; 5) до..ма.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2, 4. **Г)** у 1, 3, 4. **Д)** у 2, 4, 5.

---

**13.** Колькі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку давальнага склону ў вершаваных радках з паэмы М. Гусоўскага “Песня пра зубра”?

*Музыка нашых лясоў мілагучнасцю строгай*
*Вуху і сэрцу мілей за літаўры і ліру.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**14.** Які назоўнік з прапанаваных мае значэнне ‘група коннікаў на прагулцы’?

*1) кавардак; 2) каверкот; 3) кавалькада; 4) кагорта.*

**А)** няма такога назоўніка. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**15.** Вызначце “чацвёрты лішні” займеннік, улічваючы разрад.

*Мой, твой, свой, той.*

**А)** няма “чацвёртага лішняга” займенніка. **Б)** мой. **В)** твой. **Г)** свой. **Д)** той.

---

**16.** У якім(-іх) сказе(-ах) з прапанаваных на месцы пропуску неабходна паставіць двукроп’е?

*1) Шматлікія вырабы з дрэва знаходзіліся раней у сенцах _ бочкі, кадушкі, ступы.*

*2) Тады _ ні адтуль ні адсюль выскачыў лось.*

*3) Кожны чалавек па-свойму перажывае _ радасць, смутак, бадзёрасць, стомленасць.*

*4) Валошкі, званочкі, незабудкі _ прыгожыя лугавыя кветкі.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**17.** Дадзены ўстойлівыя спалучэнні:

*1) не чуць ног пад сабой; 2) не па зубах; 3) грызці граніт навукі; 4) на край свету.*

Якія значэнні ім адпавядаюць?

*а) старанна вучыцца; б) далёка;*

*в) не пад сілу, не па здольнасцях; г) вельмі стаміцца.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-а, 2-в, 3-г, 4-б. **В)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в.
**Г)** 1-в, 2-б, 3-а, 4-г. **Д)** 1-г, 2-в, 3-а, 4-б.

---

**18.** Вызначце правільна напісаныя лічэбнікі.

*1) васьмідзесяты; 2) шэсцьсоты; 3) пяцітысячны;*

*4) двухсотсямідзесяцімільённы.*

**А)** усе лічэбнікі. **Б)** няма такіх лічэбнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**19.** Якія назоўнікі з прапанаваных у форме роднага склону маюць канчатак ***у***(***-ю***)?

*1) паркет; 2) сквер; 3) хор; 4) кветнік.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**20.** Прачытайце ўважліва сказы:

*1. Адшумела лета каласамі, у паплавах зялёных паплыло; журавы на поўдзень пад крыламі паняслі ліпнёвае цяпло* (А. Куляшоў).

*2. Мы ўжо не просім міласці ў прыроды – прырода моліць літасці ў нас.* (С. Грахоўскі).

*3. На ўзгорках стаяць дубы, а ў зарэчнай далечы сінее лес, злева з-за хмызнякоў выглядаюць стрэхі хат* (І. Шамякін).

Вызначце складаны(-ыя) сказ(-ы) з рознымі відамі сувязі.

**А)** 1. **Б)** 1, 2. **В)** 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

---

**21.** Дадзены займеннікі: *1) пры мяне; 2) пры цябе; 3) пры нім; 4) пры сябе.*

Якія займеннікі правільна напісаны ў форме меснага склону?

**А)** усе займеннікі. **Б)** няма такіх займеннікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**22.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску напішаце літару ***ы***?

*1) д..джэй; 2) р..элтар; 3) мерч..ндайзер; 4) д..сантнік.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.